ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 117 (1367) ПАНЯДЗЕЛАК, 25 мая 1931 г.

На люты паход капіталістых—

працоўныя адказваюць забастоўкамі і дэманстрацыямі протэсту

Дэманстрацыя супроць фашысцкай провокацыі і поліцэйскага ўціску

БЭРЛІН.—У Штутгарце ўчора фашыстыя наладзілі з провокацыйнай мэтай дэманстрацыю ў рабочыя кварталы. Адбылася кравапралітная сутычка з рабочымі. Поліцыя разам з фашыстымі напала на рабочых. Вулічныя баі працягваліся да позьняй ночы. 10 тысяч рабочых арганізавалі дэмонстрацыю пратэсту супроць фашысцкай провокацыі і поліцэйскага ўціску.

БЭРЛІН.—Выключэньне з паседжаньня Гамбурскага ляндтагу двух комдэпутатаў паслужыла повадам да чарговага выступленьня гамбурскіх рабочых, організаваўшых дэмонстрацыю солідарнасьці з компартыяй Нямеччыны.

Ня глядзячы на паўторныя поліцэйскія атакі, усё новыя і новыя калёны дэмонстрантаў прарываліся да будынку ляндтагу. Поліцыя правяла шматлюдныя арышты.

Рэпрэсіі ўзмацніліся

ПАРЫЖ.—Газэта „Юманітэ“ паведамляе аб узмацненьні поліцэйскіх рэпрэсій супроць комуністых і іншых рэволюцыянэраў у Гішпаніі. На днях у ваколіпах Мадрыда арыштавана яшчэ 17 рабочых. Арыштаваны таксама 4 комуністыя за распаўсюджваньне комуністычных лістовак

Мітынг солідарнасьці з барацьбою гішпанскага пролетарыяту

ПАРЫЖ.—Француская компартыя організавала ў горадзе Сэра, на мяжы з Гішпаніяй, мітынг солідарнасьці з рэволюцыйнай барацьбой гішпанскага пролетарыяту. У часе дэмонстрацыі адбылася сур‘ёзная сутычка з жандарамі.

Зачынілася сэсія эўропэйскай камісіі

ЖЭНЭВА.—Падкамісія эўропэйскай камісіі на сваім учарайшым вячэрнім паседжаньні прышла ў сільнейшае замяшаньне, калі дашла справа да абмеркаваньня прапанаванага тав. Літвінавым экономічнага пакту аб ненападзе. Пасьля некаторага маўчаньня дэлегаты адзін за адным пачалі выказваць сумненьні ў магчымасьці прыняцьця прапанаванага савецкай дэлегацыяй пратаколу.

22-га мая сэсія эўропэйскай камісіі зачынілася. У заключным паседжаньні выступіў т. Літвінаў, які ўказаў, што савецкая дэлегацыя прапануе прыняць пэўныя прынцыпы, якія павінны панаваць у экономічных адносінах і якія неабходны ў інтарэсах экономічнага супрацоўніцтва, што зьяўляецца прызнанай мэтай конфэрэнцыі.

Спатканьне тав. Літвінава з замежнымі міндзеламі

ЖЭНЭВА.—Італьянскі міндзел Грандзі навясьціў т Літвінава. Потым тав. Літвінаў прыняў старшыню данцыгскага сэнату—ЦІМА. Акрамя гэтага, тав. Літвінава навясьціў польскі міндзел Залескі.

Савецкая дэлегацыя наладзіла сьнеданьне, на якім прысутнічаў нямецкі міндзел Курціус і некаторыя іншыя члены нямецкай дэлегацыі.

„Прапанова Літвінава заслугоўвае ўвагі“

БЭРЛІН.—Па паведамленьнях з Амстэрдаму, газэта „Нью Ротэрдамэр Курант“ піша: „Літвінаў у Жэнэве зрабіў адкрытую і правільную заяву аб прычынах экономічнага крызісу. Прапанова Літвінава аб заключэньні пакту экономічнага ненападу заслугоўвае ўвагі“. Газэта „Тэлеграф“ констатуе ў перадавой значныя посьпехі СССР пры адбудаваньні яго народнай гаспадаркі. Паказваючы на агромныя потэнцыяльныя багацьці Савецкага саюзу, газэта прыходзіць к вываду, што экономічнае значэньне неабходна аддаць Савецкаму Саюзу, як і іншым краінам эўропэйскага контынэнту.

Выступленьне Брыяна—радасьць польскага друку

ВАРШАВА.—Выступленьне Брыяна з крытыкай савецкай прапановы ў Жэнэве выклікала ўсеагульную радасьць у польскім друку. У загалоўках і рэдакцыйных артыкулах газэты пішуць, што „савецкая дэмагогія прайшла праз агонь крытыкі Брыяна“, што „савецкая прапанова аб экономічным ненападзе недастойна дыскусіі“ і г. д.

Па капіталістычным сьвеце

* Як паведамляюць з Турцыі, пасьля скарачэньня зарплаты 50 рабочым на 50 проц., 3 тысячы рабочых тэкстыльнай фабрыкі ў Бомбэі абвясьцілі забастоўку протэсту.

* Лік стачачнікаў у Парыжы вырас на 2 тысячы чалавек ахапіўшы 39 тысяч рабочых.

* У польскі морскі порт Пуцка прыплыла сёньня з Стокголму эскадрыльля францускіх гідропланаў, пад камандай францускіх афіцэраў.

* Савецкая делегацыя на чале з таварышом Літвінавым выехала ў Бэрлін.

* Брыян па сваім звароце з Жэнэвы быў прыняты Лявалем. Адбылася доўгая гутарка, у якой Брыян настойваў на сваім жаданьні выйсьці ў адстаўку.

* Міністар унутраных спраў Нямеччыны, Лютэнбэрг, забараніў 30-га верасьня ўсе політычныя мітынгі і дэмонстрацыі пад адкрытым небам. Забарона ў першую чаргу датычыць компартыі і рэволюцыйных організацый.

* У Осло (Норвэгія) адбыўся наладжаны норвэскай компартыяй мітынг солідарнасьці з шведзкімі забастоўшчыкамі. Рабочая партыя наладзіла дэмонстрацыю беспрацоўных і звольненых рабочых. У дэмонстрацыі ўдзельнічала 4 тыс. чалавек.

* У Дэйсбургу (Рэйнскай вобласьці) адбылася сутычка рэволюцыйных рабочых з фашыстамі. Поліцыя напала на рабочых з гумовымі дубінамі, а потым пусьціла ў ход агнястрэльную зброю.

За першыя дзьве дэкады

5-га мая павінен быў пачацца і разгарнуцца [illegible] шыр тарпяны сэзон.

Сёлетні тарпяны сэзон павінен мець асабліва важнае значэньне ў разгортваньні электро-будаўніцтва БССР і пераводзе ўсёй беларускай прамысловасьці на свой мясцовы, тарпяны апал.

Мінулі амаль дзьве дэкады. З фронту торпараспрацовак ідуць зусім нездавальняючыя весткі.

Па большасьці заводаў праца разгарнулася зусім слаба. Торпазаводы не організавалі сваю працу, ня здолелі ўзяць сапраўды ўдарныя тэмпы.

Зьмешчаны сёньня матар‘ял з усёй яскравасьцю гэта пацьвярджае.

Рашаючы момант для пасьпяховага выкананьня плянаў торпа-сэзону—гэта забясьпечаньне торпараспрацовак рабочай сілай, організацыя работ на прынцыпах шырока-разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Комсамол Беларусі—шэф электрыфікацыі—абавязаўся забясьпечыць тарпяны Донбас рабочай сілай, абавязаўся даць 1000 комсамольцаў-ударнікаў торпазаводам.

Але на сёнешні дзень разьвёрстка ЦК ЛКСМБ па мобілізацыі комсамольцаў на торпазаводы ня выканана. Пошта-тэлеграма сэкратара ЦК ЛКСМБ тав. Гуткіна, адзначаючы нездавальняючы ход выкананьня разьвёрсткі, абавязвае пад адказнасьць сакратароў раённых і гарадзкіх камітэтаў забясьпечыць выкананьне дадзенай разьвёрсткі.

Неабходна палажыць канец злачыннаму сабатажу важнейшай справы. Комсамольская тысяча павінна быць дадзена, ня гледзячы ні на якія перашкоды.

Комсамол і ўся пролетарская грамадзкасьць Савецкай Беларусі павінны адчуваць адказнасьць за ход торпасэзону, за тэмпы ператварэньня БССР у тарпяны Донбас.

Комсамол прадпрыемстваў і ўстаноў, якія забясьпечваюць торпазаводы спэцвопраткай і харчаваньнем, павінны несьці адказнасьць за выкананьне сваіх функцый.

Комсамол мэталюргічных заводаў, як завод імя Варашылава і „Комунар“, павінен забясьпечыць выкананьне пляну выпуску машын для торпазаводаў. **Лёзунг дня:—Ня заўтра, а сёньня БССР павінна стаць тарпяным Донбасам.**

За гэта трэба змагацца. За гэта адказвае ўвесь комсамол Савецкай Беларусі.

БАРАЦЬБУ ЗА МІЛЬЁН ТОН ПАЧЫНАЦЬ З СЯУБЫ

Комсамол Лёзны гэтым ня кіруецца

Засеяць 500 тысяч га сілосных культур—ударная задача

Перамагчы бяскорміцу

Плян сілосаваньня ў 6.210 тон выканаць і перавыканаць

У мінулым годзе сілосаваньне кармоў па Лёзьненскім р-не правалена. Плян сілосаваньня выканан усяго толькі на 9,8 проц.

Асноўная прычына ў гэтым тое, што за сілосаваньне ўзяліся позна, не засеялі адпаведнае плошчы сілосных культур, і што сілосную кампанію праводзілі выключна комсамол, а колгасы і іншыя кооперацыйныя організацыі сталі ў баку.

Гэтыя ўрокі мінулага году трэба ўлічыць і ўзяцца за сілосаваньне зараз-жа, у час вясеньняга севу. За гэты час неабходна засеяць патрэбную плошчу сілосных культур, разгарнуць рамонт старых і будаўніцтва новых сілосных баштаў, траншэй і ям.

Плянам НКЗБ па Лёзьненскім р-не прадугледжана засілосаваць 6.180 тон. Сустрэчным плянам гэтая лічба павялічана да 6.210 тон, з іх на долю колгасаў прыпадае засілосаваць 4.250 тон, дзеля чаго ім трэба засеяць 97 га, што дасьць 37 проц. патрэбнай для сілосаваньня масы. За кошт караньплодаў і гародніны трэба выканаць плян на 25 проц., за кошт атавы сенажацяй і пустазельля—14 проц., за кошт бульбяніку—26 проц

Па саўгасах і райспажыўсаюзе плян сілосаваньня вызначан у 950 тон і па аднаасобным сэктары—1010 тон.

Для выкананьня гэтага пляну ёсьць усе магчымасьці. Трэба толькі, каб комсамол, колгасы і іншыя грамадзкія організацыі па-баявому ўзяліся за гэту работу. Нажаль, ні комсамол, ні саўгасы, ні колгасы пакуль што не ўдзяляюць належнай увагі пасеву сілосных культур, а гэта можа прывесьці да леташніх недадзных вынікаў—зрыву сілоснай кампаніі.

Пост „Ч. З.“ Кароль.

Грэскі райкоопсаюз зрывае сілосаваньне

У Грэскім р-не да пасеву сілосных культур не прыступалі. Райкоопсаюз, атрымаўшы насеньне, не забясьпечыў ім колгасы і аднаасобны сэктар. Пры праверцы на складзе знойдзена 3333 кілё насеньня сілосных культур.

Сілосная бакшта ў колгасе Энгельса (Уваравіцкі раён).

Рад колгасаў, якія летась атрымалі вялікую выгаду ад сілосаваньня, сёлета павялічваюць у некалькі разоў пасеўплошчу сілосных культур.

Колгас „Чырвоны Маяк“ летась упяршыню заклаў 6000 пудоў сілосу. Некаторыя колгасьнікі ня верылі, што сілос будзе карысным кормам, сьмяяліся: „нічога ня выйдзе з вашым сілосам, дарма працуеце“ і г. д. Аднак „Чырвоны маяк“ два месяцы карміў сілосам 120 кароў, 50 штук цялят і 70 авечак. Удой малака значна павялічыўся. Да кармленьня сілосам карова давала 1,5—2 літры малака ў дзень, ад сілосу ўдой павялічыўся да 3—3,5 літраў, а месячны ўдой аднэй каровы ў сярэднім павялічыўся з 51 да 93 літраў.

Пост „ЧЗ“ Макарэнка.

Узьняць тэмпы сяўбы тэхнічных культур

Даць адказ: чаму не далі руйнуючага адпору опортуністычнай практыцы зямельных органаў?

Усім РК ЛКСМБ

„Чырвоная Зьмена“ ад 23-га мая сыгналізавала аб права-опортуністычнай практыцы ў Касьцюковіцкім, Камарынскім, Хойніцкім, Уваравіцкім і Менскім раёнах, якія скарацілі пасеўплошчу пад лёнам і канаплямі, а камсамольскія організацыі гэтых раёнаў ня выступілі супроць фактаў скарочаньня пасеўплошчы. ЦК ЛКСМБ катэгорычна патрабуе ад бюро райкомаў гэтых раёнаў даць праз „Чырвоную Зьмену“ адказ, што конкрэтна комсамол робіць у барацьбе за лён і каноплю, чаму ня выступілі супроць скарочаньня пасеўплошчы пад лёнам і канаплямі. Чаму прымірэнча аднесьліся да опортуністычнай практыкі раённых зямельных органаў?

„Чырвоная зьмена“ таксама констатавала па раду раёнаў—Чырвонапольскім, Чачэвіцкім, Масьціслаўскім, Капыльскім і Шклоўскім—нездавальняючыя тэмпы сяўбы тэхнічных культур, за што „Чырвоная зьмена“ ўзнагародзіла комсамольскія організацыі пералічаных раёнаў сьцягам ганебна адстаючых. ЦК прапануе гэтым райкомам ЛКСМБ тэрмінова ўжыць энэргічныя захады.

На аснове гэтых фактаў і папярэдніх вынікаў ходу сяўбы тэхнічных культур (лён, каноплі), ЦК ЛКСМБ катэгорычна прапануе ўсім райкомам ЛКСМБ прыняць самыя энэргічныя меры барацьбы для ўзьняцьця тэмпаў сяўбы і барацьбы супроць скарочаньня пасеўплошчы.

ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе РК ЛКСМБ сыстэматычна, раз у дэкаду, даваць у ЦК і „Чырвоную зьмену“ інформацыі аб праробленай рабоце комсамольскімі організацыямі ў барацьбе за лён і каноплі, за максымальна хуткае сканчэньне сяўбы.

Першую інформацую даслаць не пазьней 28-га мая.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГУТКІН.

Месячнік друку

ПЕРАБУДОВА РАБОТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ, КОНКРЭТЫЗАЦЫЯ КІРАЎНІЦТВА ІМІ—УМОВА ДАЛЕЙШАГА ЎЗДЫМУ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

Ячэйка сьпіць

Комсамольская ячэйка Будвучу да гэтага часу нічога конкрэтнага не зрабіла для правядзеньня месячніку друку. Праца рэдколегіі насьценгазэты ў заняпадзе. За 9 месяцаў выпушчана ўсяго чатыры нумары газэты. У гэтых нумарох газэта не змагалася з усімі недахопамі школы ў галіне выкананьня прамфінпляну і пасьпяховага ходу вучобы, а на гэтым фоне якраз вялізарнейшы прарыў. Беларусізацыя пастаўлена няважна. Пастанова аб пераводзе школ на беларускую мову ігноруецца. Выкладчыкі ўжываюць пераважна расійскую мову і месячнік друку, які павінен быў даць сапраўдны зрух у гэтым напрамку, нічога рэальнага яшчэ не дае. Комсамольская ячэйка не разгортвае юнкорруху.

Менскаму гаркому ЛКСМБ трэба прыняць адпаведныя крокі, каб узмацніць работу па месячніку друку і разгарнуць падрыхтоўчую работу да рабселькораўскага зьезду. **Л. Ф.**

БЕЛПЭДТЭХНІКУМ ЗМАЗВАЕ ПОЛІТЫЧНУЮ СУТНАСЬЦЬ МЕСЯЧНІКУ ДРУКУ

Пастанова ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху і аб самаправерцы нізавога друку і правядзеньня месячніку друку злачынна ігноруецца як парт'ячэйкай, так і комсамольскай організацыяй Менскага Белпэдтэхнікуму.

Бюро колектыву ЛКСМБ і курсавыя ячэйкі для рэалізацыі гэтых пастаноў нічога не зрабілі, не ўзьнялі грамадзкай думкі навокал насьценгазэты і і ўсяго друку. На сходзе колектыву ЛКСМБ абмежаваліся двуххвіліннай інформацыяй аб месячніку друку. Асноўная палітычная задача месячніку была зьвязана пастановаю сходу: „прыняць да ведама".

Насьценгазэта пры Белпэдтэхнікуме выходзіць рэдка, ня больш аднаго разу ў месяц. Матар'ял у газэту, які сыгналізуе аб прарывах у тэхнікуме ў справе падрыхтоўкі пэдкадраў, марынуецца. Насьценгазэта наогул ня б'е па конкрэтных носьбітах зла. З студкорамі за ўвесь год ня было праведзена ніводнай нарады. Самаправерка насьценгазэт не праведзена. Ніхто аб ёй і ня думае, каб узьняць ролю газэты як самую вострую, самую моцную зброю партыі ў змаганьні за падрыхтоўку пэдкадраў.

Усё гэта вынік праваопортуністычнай недаацэнкі друку партыйна-комсамольскім колектывам тэхнікуму.

Белпэдтэхнікум, які концэнтруе вялікую армію культурных сіл, павінен быў з усёй рашучасьцю дабівацца правесьці месячнік друку з найвялікшымі дасягненьнямі.

Студэнты, якія зараз выехалі на вытворчую практыку, павінны ў сваёй штодзённай працы дапамагчы мясцоваму саўгасна-колгаснаму друку. Пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі, рэдколегія павінна на практыцы ажыцьцявіць лёзунг: „кожны рабселькор-ударнік, кожны ўдарнік-рабселькор".

Б. Харытончык.

Працуюць самацёкам

Пытаньне аб лавядзеньні тыражу „Чырвонай Зьмены" за 60-тысяч яшчэ не абгаварвалася ў Бабруйскай школе Дарбувучу.

Праца па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная Зьмена" ідзе самацёкам. На 135 вучняў выпісваецца ўсяго 50 экзэмпляраў. Пастанова 10-га зьезду комсамолу Беларусі давесьці „Чыр.Зьмену" да кожнага комсамольца далёка ня выконваецца. Ячэйка не займалася гэтым пытаньнем. Некаторыя комсамольцы ня ведаюць нават таго, што „Чырвоная Зьмена" адсьвяткавала свой 10-цігадовы юбілей.

Т. Пратасеня.

„Ч.З."—у маладзёжныя масы

Слуцкая 4-я яўрэйская 7-мігодка бярэ на сябе абавязак завербаваць на „Чырвоную Змену" ня менш 50 падпісчыкаў. Усе ўпаўнаважаныя па „ЧЗ" абвясьцілі сябе ўдарнымі. склаўшы соцумовы між сабою на распаўсюджаньне „ЧЗ" і выклікаўшы 3-ю яўрэйскую 7-мігодку пасьледваць гэтаму прыкладу.

3 я яўрэйская 7-мігодка выклік прыняла і ўзяла на сябе абавязак распаўсюдзіць ня менш 70 экз. „ЧЗ", абвясьціўшы сябе ўдарнай на лепшае і хутчэйшае правядзеньне падпіскі на „ЧЗ".

Выклікаем на соцспаборніцтв Ленінскую ШКМ.

Сьвярсўка.

Выклік Слуцку прымаем

Бюро Рагачэўскага РК ЛКСМБ на сваім пасяджаньні заслухала выклік Слуцкай організацыі ЛКСМБ на соцспаборніцтва па выпісцы „Ч. З.", разгортваньне тыражна-масавай работы і стварэньне юнкораўскіх брыгад.

Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў РК, некаторыя ячэйкі не разгарнулі масавай работы вакол газэты.

Бюро вынесла пастанову скласьці сустрэчны плян на 200 экз. „Ч. З."

Аднача́сова організавана 10 юнкорбрыгад па раёне. Пастаўлена пытаньне аб узмацненьні кіраўніцтва комсамольскіх ячэек юнкорамі, склікаўшы 24-га мая, разам з рэдакцыяй газэты „Комунар", нараду рабселькораў і юнкораў.

Іваноў.

Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" адбудзецца

ПАШЫРАНАЯ НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЮ

РАЗЬВІЦЬЦЯ ЭНЭРГЕТЫКІ БССР І ЗАДАЧЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

На нараду запрашаюцца спэцыялістыя, прадстаўнікі комсамольскіх і партыйных ячэек, рэдактары шматтыражак і насьценгазэт, ударнікі, рабкоры і юнкоры наступных установу і прадпрыемстваў: ВЭО, СЭО, Энэргааддзел ВСНГБ, Белторпу, Эльводу, Дзяржпляну, Гаркому ЛКСМБ, заводу Варашылава, „Комунар", „Бальшавік" і „Дрэваапрацоўшчык".

Просьба прыйсьці без спазьненьня.

РЭДАКЦЫЯ.

У нетры тарпянога Донбас

Не дапусьціць перабояў у працы торпазаводаў

Тарпяныя заводы павінны забясьпечыць поўнае выкананьне пляну торпаздабычы. Даць 1000 комсамольцаў—ударнікаў, забясьпечыць заводы патрэбнымі машынамі

Усім сакратарам ГК і РК ЛКСМБ

Пошта-тэлеграма

Мобілізацыя 1000 комсамольцаў на торпараспрацоўкі ня выконваецца. ЦК расцэньвае гэта, як сабатаж і нежаданьне выконваць рашэньняў ЦК, накіраваных на ўмацаваньне комсамольскім ядром торпазаводаў, як палітычную недаацэнку пераўтварэньня Беларусі ў тарфяны Донбас—і катэгорычна прапануе пад асабістую адказнасьць сакратароў райкомаў і гаркомаў выканаць мобілізацыю комсамольцаў на торпазаводы да першага чэрвеня, 28—V інформуйце аб прынятых мерах.

Сакратар ЦК ЛКСМБ **Гуткін.**

Ход тарпянага сэзону па Беларусі

Тэлеграфныя весткі аб ходзе тарпянага сэзону кажуць аб тым, што раду тарпяных заводаў неабходна тэрміновая дапамога мясцовых партыйных, прафсаюзных і савецкіх установаў.

Трэба лічыць злачынным, што на старых заводах, як „Закрашынскі мох", „Ленінскі шлях", „Зьвязда", яшчэ не прыступілі да пачатку сэзону і нават ведомы прычыны затрымкі пачатку сэзону.

На торпазаводах „Бальшавік", „Вялікі мох", „Чырвоная Беларусь", „Чырвоны Сьцяг" не прыступілі к пачатку сэзону з-за несвоечасовай зборкі машын.

З-за затрымкі стальнога ліцьця Гомельскім заводам „Рухавік рэволюцыі" менскі завод „Полымя рэволюцыі" затрымлівае адпраўку 8 транспортэраў, а гэта азначае прарыў у 500 тон торпу кожны дзень.

З 12 машын і 36 арцеляй па малому гідроторпу працуе толькі 1 машына—3 арцелі, бо Саюзторп не даў поўнага набору ланцугоў.

З 20 фрэзерных машын ні адна не працуе. Саюзторп корміць абяцанкамі, кожны дзень затрымка з абсталяваньнем для фрэзорнага торпу складае прарыў у 2400 тон.

З навербаваных 5809 ч. тарпянікаў прыбыла 2368 ч., з 3658 ч. тарпяніц прыбыла 1665 чал.

Белкоопсаюз зрывае забясьпечаньне рабочых прадуктамі. Замест 30 сталовак адчынена 15. Выпучаных Саюзторпам і Наркомсабам прадукты і прамтавары для забясьпечаньня рабочых торпазаводаў на месца работ коопэрацыя поўнасьцю не адправіла.

Мясцовыя організацыі павінны выканаць пастанову ЦК КП(б)Б і павярнуцца тварам да тарпянага сэзону.

Я. Б.

Торпа-прэсы будуць

Менскі чырвонаштандарны завод імя Варашылава ўзяў на сябе абавязак да тарпянага сэзону выпусьціць 10 торпа прэсаў.

4 машыны ўжо здадзены і працуюць на торпа-распрацоўках БССР.

Патрэбнае для зборкі машын стальное ліцьцё прыбывала з-за межаў БССР ня добрай якасьці і, акрамя таго, заводакіраўніцтва несваячасова забясьпечыла машына-зборачную брыгаду патрэбнымі дэталямі.

Усё гэта спрыяла таму, што за ўдарны квартал заказ на торпапрэсы выканан несваячасова. Замест 6 торпа-прэсаў выпушчаны толькі 4.

Зараз машына-зборачная брыгада паставіла перад сабой мэту: ліквідаваць запазычанасьць ударнага кварталу і выканаць апошняе заданьне. Гэта значыць, што трэба к канцу мая даць тарпяному Данбасу 6 торпа-прэсаў.

Брыгада працуе вельмі інтэнсыўна. Комсамольцы паказваюць сапраўдныя прыклады самаадданай працы, працуючы ў некалькі зьмен без адпачынку.

Брыгада і ўся заводкая грамадзкасьць упэўнены ў тым, што тарпяны Донбас патрэбныя машыны атрымае.

Пост „ЧЗ" **І. Гельфанд, А. Левін.**

У рэдакцыю „Чырвонай Зьмены" ад г-на в. Людзьвінаўкі і с-с, Азарыцкага р-ну Салаўя Валодзі Янкавага

ЗАЯВА

З ростам нашай прамысловасьці патрэбны ёй апал. А мы добра ведаем, што ў нас ёсьць пастанова аб тым, каб на будучы год перавесьці ўсю прамысловасьць на тарпяны апал, а пагэтаму прашу рэдакцыю „Чырвонай Зьмены" прыняць мяне ў комсамольскую „тысячу" для пасылкі на фронт распрацоўкі торпу.

Прасіцель Салавей В. Я.

P. S. Я ўжо прыняты комсамольцам Прасьветаўскай яч. ЛКСМБ, білета яшчэ ня маю, але хачу аддаць свае сілы прамысловасьці.

Салавей

Сэкратарыят ЦСПСБ аб разгортваньні торпсэзону

(З пастановы сэкратарыяту)

Рашэньне партыі і ўраду аб пачатку дабычы торпу з 5-га мая не рэалізавана. Да 12 мая было пушчана ўсяго 26 машын, што складае—35 проц. Гэта з першых-жа дзён стварае напружанасьць у выкананьні праграмы, Забясьпечанасьць рабочай сілай выражаецца: па здабычы торпу ў 5.809 ч. (100 проц.), па сушцы і ўборцы торпу ў 3.652 ч. (56,5 проц.) Шэраг торпзаводаў праявілі выключную непадрыхтаванасьць і безадказнасьць у падрыхтоўцы да пачатку работ.

Сэкратарыят ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Пацьвердзіць рашэньні ЦП саюзу торпа-сланцавай прамысловасьці аб прыцягненьні да адказнасьці дырэктара і тэхнарука торпзаводу „Шлях Соцыялізму" за зрыў пачатку сэзону а таксама і дырэктароў торпазаводаў „Колектыўная Праца" і Міхановічы за тое, што самаўласна кінулі вытворчасьць.

Даручыць сэктару масавай работы ЦСПСБ, сумесна з ЦП саюзу торпасланцавай прамысловасьці, прыняць канкрэтныя захады да выяўленьня конкрэтных вінавайцаў у зрыве прамфінпляну;

2. Абавязаць кіраўніцтва торпазаводаў тэрмінова паслаць адказных вярбоўшчыкаў на вярбоўку работніц па здабычы і ўборцы торпу. Райпрофсаветам, у раёнах якіх праводзіцца вярбоўка, забясьпечыць дапамогу ў растлумачальнай рабоце і прыцягненьню жаночай рабочай сілы на торп, устанавіўшы кантроль над работай вярбоўшчыка і клясавым падборам вярбуемых.

3. Абавязаць Орг.сэктар ЦСПСБ не пазьней 25-га мая скончыць выдзяленьне 10-ці профпрацаўнікоў у распараджэньне ЦП саюзу торпа-сланцавай прамысловасьці.

4 Даручыць сэктару кадраў—тав. Ковенскаму разам з тав. Горэглярам—тэрмінова прасіць у ЦК ЛКСМБ організаваць праверку выкананьня дырэктыў аб выдзяленьні 1000 комсамольцаў.

5. Абавязаць сэктар масавай і культурнай работы ЦСПСБ выкарыстаць вопыт новай формы соцыялістычнай сувязі фабрык і заводаў, спажыўцоў торпу з торпазаводамі, вызначыўшы формы канкрэтнай дапамогі па лініі гаспадарчых органаў (дапамога ў кіраўніцтве, перанясеньне вопыту з прадпрыемстваў на торпзаводы, узаемадапамога ў рабоце цэхаў і аддзелаў, ТНБ, рацыяналізацыя, справаздачнасьць, калькуляцыя, супольныя тэхнічныя нарады і інш).

6. ФЗМК шэфствуючых прадпрыемстваў і электрастанцыі ўключыцца ў непасрэдную дапамогу тарпкомам у правядзеньні вытворчай, масавай і культурнай работы, укараненьня форм соцыялістычнай працы, устанавіць пляновую дапамогу ў штодзённай саюзнай рабоце у сэзон торпкамітэтам і іх сэктары, камісіям і інш.

Асабліва узмацніць шэфскую работу і практычную дапамогу у надыходзячыя перавыбары тарпяных камітэтаў—з 15-V па 15-VI:

7. Зацьвердзіць сьпіс прадпрыемстваў замацаваных для шэфства над торзаводамі.

Абавязаць райпрофсавет і ФЗМК прадпрыемстваў-спажыўцоў закончыць да 25-га мая работу па організацыі і афармленьню вытворча - культурнага шэфства выпрацаваўшы супольныя конкрэтныя меры ўдзелу ў практычнай дапамозе ў правядзеньні торпсэзону. Прыняцьце шэфства замацаваць абмеркаваньнем на агульных сходах і конфэрэнцыях рабочых;

8. Абавязаць ЦП Саюзу маш.-буд. прамысловасьці ўзяць пад нагляд торпа-заводы: Цна і Міхановічы, замацаваўшы за імі членаў прэзыдыуму ЦП. Прозьвішчы т. т. паведаміць ЦСПСБ да 15-га мая г. г.

9. А першай палове чэрвеня заслухаць паведамленьне ЦП с. торпа-сланцовай прамысловасьці і прэзыдыуму 2-х райпрофсаветаў аб ходзе торпасэзону і а другой палове чэрвеня даклад 2-х торпазаводаў з садакладам райпрофсаветаў і ФЗМК шэфствуючых прадпрыемстваў.

Сэзон на „Грэбеневе" пачаўся

На торпазаводзе „Грэбенева" у сучасны момант працуюць тры машыны, замест намечаных па пляну 6, тлумачыцца гэта тым, што з самага пачатку сэзону машыны стаялі ўвесь час некранутымі. Калі-ж было дана распараджэньне распачаць сэзон не пазьней 5-га мая, толькі тады зашавяліліся на мясцох. Пачалася гарачка ў рамонце і зборцы машыны. Зусім ясна, што такая праца не дала добрых вынікаў. 2 машыны пушчаныя 6-га мая ўвесь час псуюцца. 3-ю машыну з вялікімі цяжкасьцямі ўдалося пусьціць толькі 10-га мая.

Ня лепш наладжана забесьпячэньне. Сталоўку не дабудавалі да гэтага часу. Рабочыя туляцца ў адным куточку. Харчаваньне вельмі дрэннае. Так, 11-га мая Магілеўскае Сельпо прыслала грачнёвую крупу. Зварылі яе рабочым на сьнеданьне. Крупнік аказаўся тухлым. Рабочыя прышлі ў заводакіраўніцтва з міскамі гэтага крупніку і крычалі, што яны ня могуць капаць канавы пры такім харчаваньні. І сапраўды крупеню нельга было есьці.

Культмасавай працы да гэтага часу не вялося. Толькі за апошні час пачалі абы-як працаваць.

Нельга прайсьці міма адносін магілёўскага райкому да торпазаводу. Пасьля дакладу дырэктара т-з т. Варанога на бюро РК аб становішчы заводу, райком вынес цэлы рад пастаноў. Але яны да гэтага часу ня выканы.

Г. К.

ФРАНТЫ РЭКАНСТРУКЦЫІ ЎДАРНІЦКІМ СТРОЕМ ШТУРМУЙ, БАЯВАЯ МАСТАЦКАЯ ЗБРОЯ!

Ліквідаваць адставаньне літаратуры ад тэмпаў соцыялістычнага аудаўніцтва, дапамагчы Бел'АПП'у перабудаваць сваю работу, пераключыцца на баявое выкананьне рашэньняў пленуму БелАПП, організаваць сталую працу з ударнікамі, уступіўшымі па закліку ў літаратуру—наша неадкладная задача.

Ленінскі комсамол, высунуўшы з сваіх радоў значную частку пролетарскіх пісьменьнікаў, накіроўваючы сваіх ударнікаў зараз у літаратуру, бязумоўна ня зьнімае з сябе адказнасьці за іх творчасьць, за той прарыў, які мае месца ў літаратуры.

Рахунак „Чырвонай зьмены" БелАПП'у, стварэньне літбрыгады пры „Чырвонай зьмене" з белапаўцаў-ударнікаў, уступіўшых у літаратуру. літстудыйцаў—ёсьць важны крок у барацьбе за шпаркія тэмпы разьвіцьця і росту пролетарскае літаратуры.

Паказаць гэроізм, уздым, барацьбу пролетарыяту на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, паказаць краіне нашых гэрояў такімі, якімі яны ёсьць, паказаць новага чалавека, які нараджаецца ў тэмпах бальшавіцкіх перамог, аўладаць тэхнікай—задача пролетарскай літаратуры сёньня.

ДА ВЫНІКАЎ ПЛЕНУМУ ПРАЎЛЕНЬНЯ БелАПП

1. У БАРАЦЬБЕ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ІДЭЁВАСЬЦЬ

Артыкул адказнага сэкратара БелАПП тав. П. ГАЛАВАЧА

Ад Чаротавых „Босых на вогнішчы" да стварэньня ў 1923 годзе ўсебеларускага аб'яднаньня „Маладняк"; праз „Маладняк" да разьмяжаваньня з „Узвышшам" і „Полымям", тым самым да больш выразнага акрэсьленьня сваіх ідэолёгічных позыцый, і праз гэта да ўсебеларускай конфэрэнцыі ў лютым 1928 году, якая вырашыла пытаньне аб далучэньні да ВОАПП,у і далей да стварэньня ў лістападзе 1928 г. Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў,—каротка, схэматычна, ў агульных словах, шлях беларускае пролетарскае літаратуры да яе 1-га з езду.

Беларуская пролетарская літаратура ўвесь час актыўна змагалася супроць нацыянал-дэмократычнае і буржуазна-кулацкае рэакцыі ў беларускай літаратуры.

Пад кіраўніцтвам партыі, з дапамогай ўсёй пролетарскай грамадзкасьці, БелАПП выкрыла антысавецкі, кулацкі, нацдэмаўскі твар Язэпа Пушчы, Дубоўкі, Бабарэкі і іншых узвышэнцаў; контррэволюцыйны нацдэмаўскі твар Дудара; нацыянал-дэмократычную сутнасьць творчасьці Зарэцкага, („Крывічы", „Падарожжа на новую зямлю"), Ц. Гартнага („Здарэньне з камісарамі") і некаторых іншых.

Час паміж першым зьездам БелАПП і другім пашыраным пленумам (12—16-V—31 г.) прайшоў пад знакам ідэолёгічнага і творчага росту беларускае пролетарскае літаратуры і пролетарскіх літаратур другіх народаў БССР.

На пашыраны пленум БелАПП прышла ўжо, як вядучы атрад ўсяе савецкае літаратуры, як адзін з пер давых атрададаў ВОАПП, як верная апора партыі на літаратурным фронце. Гэта дало пленуму магчымасьць разгорнута ставіць і пытаньні становішча пролетарскае і ўсяе савецкае літаратуры.

У якіх-жа ўмовах

развіваецца пролетарская і савецкая літаратура сёньня? Чаго вымагае ад літаратуры дадзены этап разьвіцьця нашае краіны? Гэта пытаньні, адказ на якія пленум павінен быў даць і даў.

БССР за час першых двух гадоў пяцігодкі зрабіла вялізарныя крокі ўперад ва ўсіх галінах і гаспадарчага і культурнага разьвіцьця. Уступілі ў строй дзесяткі новых соцыялістычных прадпрыемстваў; выканана пяцігодка па гарбарнай і папяровай прамысловасьці БССР; больш трыццаці процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў колгасах; зроблены вялізарныя дасягненьні ў справе культурна-нацыянальнага будаўніцтва.

Дасягненьні ў справе соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР здабыты ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня. У абставінах жорсткага клясавага змаганьня адбываецца соцыялістычнае будаўніцтва і сёньня. Змаганьне ідзе на ўсіх, самых вялікіх і самых малых вучастках соцыялістычнае будоўлі. У гэтым змаганьні пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі вырастае перамога соцыялізму.

Пролетарская літаратура—зброя ў руках пролетарыяту ў яго змаганьні за соцыялізм. Гэта ставіць перад пролетарскай літаратурай

шэраг адказьнейшых задач.

Трэба пасіліць ідэёвую няпрымірымасьць БелАПП у змаганьні з варожымі пролетарыяту ідэолёгічнымі тэндэнцыямі, як нацыянал-дэмократызм, як пераверзеўшчына, ідэалізм. Нацыянал-дэмократызм у літаратуры разьбіты, але яшчэ далёка не дабіты цалкам. Рэцыдывы нацыянал-дэмократызму маюць і будуць мець мейсца, і ў творчасьці, і ў літаратуразнаўстве і ў далейшым. Гэта патрабуе ад БелАПП, і марксысцкае крытыкі ні ў якім разе не паслабляць змаганьня з нацыянал-дэмократызмам, выкрываць яго контррэволюцыйную сутнасьць.

Надзвычайна вялікае значэньне ў нашых умовах мае змаганьне з пераверзеўшчынай. Дзякуючы цэламу шэрагу прычын, пераверзеўшчына і да гэтае пары мела магчымасьць праведвацца з катэдр Б. Дз. У-ту, не сустракаючы належнага адпору. Гэта тым большае значэньне мае, што ў нашых умовах пераверзеўшчына зьяўляецца своеасаблівай праявай вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму. Прадстаўнікі пераверзеўшчыны ў сваей рабоце ў Бел. Дз. У. ніякай увагі не аддавалі беларускай пролетарскай і савецкай літаратуры, ігнаравалі яе. У выніку—студэнты свае работы, зьвязаныя з прапрацоўкай мэтодолёгічных пытаньняў, будавалі на аналізе творчасьці амаль **выключна** расійскіх клясыкаў, у вельмі рэдкіх выпадках на аналізе твораў паасобных пролетарскіх расійскіх пісьменьнікаў і зусім ігнаравалі літаратуру беларускую. Вынікам гэтага-ж зьяўляецца і адрыў студэнцтва літаратурна-лінгвістычнага аддзяленьня і асьпірантуры ад нашага літаратурнага жыцьця, які мае месца і на сёнешні дзень, хаця ў апошнія дні некаторыя крокі ў напрамку ліквідацыі гэтага адрыву ўжо зроблены.

БелАПП, марксысцкая крытыка,

правялі вялікую работу

па змаганьню з нацыянал-дэмократызмам і ў галіне творчасьці і ў літаратуразнаўстве, але далёка недастаткова яшчэ вядзецца змаганьне супроць пераверзеўшчыны, супроць ідэалізму, за марксысцка-ленінскую мэтодолёгію. На барацьбу за аўладаньне ленінскай спадчынай у пытаньнях мастацтва, павінны быць мобілізаваны сілы БелАПП

Што да змаганьня з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам, дык трэба адзначыць, што БелАПП не аддаваў гэтаму пытаньню дастатковае ўвагі.

Калі нацдэмы адмаўлялі магчымасьці разьвіцьця беларускае пролетарскае літаратуры і гаварылі пра беларускую літаратуру, як адзіна-нацыянальную, дык вялікадзяржаўныя расійскія шовіністыя адмаўляюць наогул магчымасьць разьвіцьця беларускае літаратуры, у лепшым выпадку адводзяць ёй месца на задворках, як літаратуры другараднай і лічаць за нізкае для сябе займацца гэтай літаратурай; альбо абвяшчаюць усю беларускую літаратуру агулам нацдэмаўскай і, хаваючыся нібы за барацьбу супроць нацдэмаўшчыны, вядуць барацьбу супроць пролетарскае беларускае літаратуры.

Вынікам недастатковае барацьбы БелАПП з вялікадзяржаўным шовінізмам зьяўляецца своеасаблівы шкодны хвасьцізм, які меў месца ў Бабруйскай філіі. Філія склала брыгаду з лепшых сіл у дапамогу рабочым машына-будаўнічага заводу імя Сталіна ў іхным змаганьні за выкананьне промфінпляну. Справа надзвычайна добрая. Але дрэнна тое, што брыгада, як толькі патрапіла на завод, адразу-ж перайшла на расійскую мову ў напісаньні і лёзунгаў і вершаў. Такая работа надзвычайна на руку вялікадзяржаўным расійскім шовіністым, якія крычаць пра „гвалтоўную беларусізацыю" рабочых, пра тое, што рабочыя нібы беларускай мовы ня ведаюць, ня ўжываюць і г. д. Брыгада філіі ў дадзеным выпадку зрабіла політычную памылку, пайшоўшы ў хвасьце адсталых рабочых, замест таго, каб сваёй работай пасабіць грамадзкім організацыям у справе беларусізацыі на заводзе.

Змаганьне з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай у барацьбе партыі за ленінскую нацполітыку, у галіне літаратуры патрабуе большай увагі да гэтага пытаньня ад усіх філій БелАПП, ад кожнага белапаўца паасобку і значнай актывізацыі ў справе популярызацыі беларускай пролетарскае і савецкае літаратуры ад профсаюзных клюбных і фабрычных бібліотэк. Кніжкі беларускага пролетарскага і савецкага пісьменьніка павінны заняць належнае мейсца і ў нашых бібліотэках і сярод рабочых чытачоў. Гэта ў аднолькавай меры адносіцца і да яўрэйскай і польскай літаратуры.

Давайце, хлопцы, разам працаваць!

Адкрыты ліст у рэдакцыю „Чырвонай Зьмены"

Таварышы!

За плячыма ў нас—гады барацьбы. Вось нядаўна мы сьвяткавалі Х-гадовы юбілей „Чырвонай Зьмены". Гэта—эпопэя. Дый наогул—комсамол Беларусі прайшоў вялікі шлях, шлях перамог.

Я належу да беспартыйнай часткі савецкай моладзі. Я мобілізуюся на аплату комсамольскага рахунку, прад'яўленага „Чырвонай Зьменай"—БелАПП'у. Я ўступіў у пісьменьніцкую брыгаду „Чырвонай Зьмены". Я ўпэўнен: абавязацельствы выканаю.

У кніжцы „Удар" я пісаў пра моладзь, пра комсамол. Я пачаў працу над аповесьцю пра комсамол. Аповесьць пра змаганьне комсамолу за новы быт, за культурную рэволюцыю, за інтэрнацыянальнае выхаваньне. У аповесьці—два канцавосьсі: людзі, што ідуць у колёне пад штандарам ЛКСМ і людзі, што прысталі да гэтай колёны, як прыстаюць людзі, каб прабрацца на пляц—паслухаць прамовы.

Багата матар'ялу ёсьць. Давіць матар'ял. Але трэба крышталізаваць яго. „Самая лепшая фраза—самая кароткая". Аповесьць завецца—„Наша сонца". У ёй выкарыстоўваецца штосьці з друкаванага ў „Чырвонай Зьмене".

Але гэтага мала, Я зьвяртаюся да чытачоў „Чырвонай Зьмены": вы, хлопцы, маеце цікавы матар'ял аб штодзённай барацьбе вашай за культурную рэволюцыю—шлеце яго мне".

Так у нас пісьменьнікі не рабілі, але „традыцыі"—гэта глупства. Калі „Чырвоная Зьмена" возьме над маёй аповесьцю нешта накшталт шэфства—аповесьць будзе поўнакроўней, злабадзённьней, менш будзе памылак.

Дык давайце, хлопцы, працаваць.

Член літбрыгады „Чырвонай Зьмены" Барыс Мікуліч.

Менск, 23—5—31 г.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя „Ч. З." і літбрыгада „Чырв. Зьмены" бяруць шэфства над работай т. Б. Мікуліча па напісаньню комсамольскай аповесьці „Наша Сонца". На чарговай нарадзе літбрыгады „Ч. З." з удзелам юнкораў—ударнікаў і ўдарнікаў, закліканых у літаратуру, будзе абгаворана кніга апавяданьняў Б. Мікуліча „Удар" і плян аповесьці „Наша Сонца".

Песьняру пролетарскай барацьбы і будаўніцтва

Дзямян Бедны. Імя—роднае і надзвычайна магутнае.

Песьні і поэмы Дзямяна Беднага ў эпоху грамадзянскай вайны былі мацнейшай баявою зброяй—яны запальвалі агонь імкненьня і ўпартага націску на ворага.

Дзямян Бедны быў песьняром і зьвястуном бальшавіцкай барацьбы, комуністычных ідэалаў. Ён быў душою мільёнаў, якія ішлі ў бой. Яго голас грымеў па ўсіх фронтах—ад Архангельскіх тундраў да паўднёвых мораў, ад Дняпра да Уладывастоку, ад заводзкага цэху да сялянскай хаты.

Пагроза імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі стаіць перад намі і зараз ва ўсёй сваёй аголенасьці. Капіталістыя і іх лёкаі, так званыя „соцыялістыя", бязупынна правакуюць напад на Краіну Саветаў. Паклёп, шматлікія ганебныя „кампаніі", азьвярэлая агітацыя, організацыя варожых сіл для плянавага шкодніцтва ў нашай гаспадарцы.—усё гэта тая-ж вайна ў зьмененых формах. Дзямян Бедны і тут—на варце, і тут ён заўсёды на-чаку. Са сваім вострым вокам, са сваім пачуцьцём небясьпекі, са сваім непрымірым гневам. ён—уперадзе, і яго вобразы б'юць, як удары цяжкога молата. Ён выкрывае, ён бязьлітасна прыгважджае ворага, ён б'е трывогу, ён заклікае моцна стаяць на варце.

Але рэдка хто з такою сілай, з такой гранічнай суворай прастатою стварае цэлыя поэмы аб посьпехах соцыялістычнага будаўніцтва, цудоўных гэроічных учынкаў рабочых і колгасных мас у справе рэконструкцыі нашага жыцьця ва ўсіх галінах І тут ён—не над масамі, а ў самой гушчы мас, і тут яго голас—ня голас адзіночкі. а неабдымны гул мільёнаў.

Дзямян Бедны—гэта жывы лёзунг культурнай рэволюцыі і соцыялістычнага будаўніцтва.

Як мастак, як пролетарскі поэта заўсёды ўпэўнена, бяз хістаньняў. поўны энтузіязму, ён ішоў ва ўсеўзброеньні па генэральным шляху нашай партыі, высока трымаючы у сваіх моцных руках чырвоны сьцяг пролетарскай барацьбы.

Дзямян Бедны—адзін з самых лепшых ударнікаў у радох рабочай клясы. Дзямян Бедны — прыклад для пісьменьнікаў нашай краіны, для ўсіх ударнікаў закліканых у літаратуру У яго рэба старанна вучыцца, як выкоўваць баявы вобраз, як насычаць яго дыханьнем масавых імкненьняў, як стварацць мастацтва ў сваёй гранічнай прастаце, даводзячы яго да высокай удасканаленасьці.

20 год мастацкай творчасьці Дзямяна Беднага—гэта шлях моцнага ваяўнічага бальшавіка, гэта—шлях цудоўнага і слаўнага служэньня партыі і рабочай клясе.

Тодар Гладкоў.
(„К. П".)

Сьцяпан Ліхадзіеўскі

ВЫКЛІК МАЛАДОСЬЦІ

У газэтах—
    чырвоны сьпіс:
вось яны,
    нашы ўдарныя, першыя!..
Гэту ноч
    край трывожна сьпіць,
гэты сівер
    гультайства вешае!
Край падлічвае
    страты, брак,
берасьцянкі трывог
    падлічвае.
Маладосьці поэт!
    зьбірай
    свае сілы,
        дазоры
            скліч свае!
З нас у кожнага
    дні былі,—
чырванелі
    вясною вішні
У гады
    ваяўнічых былін
мы да постаці
    цяжкай вышлі.
А калі
    бальшакамі іскрыстымі
наш экспрэс
    па-ўдарнаму рухаў,—
мы да рокатаў
    дальняй прыстані
прыкладалі
    юнацкае вуха.
Хто слабеў
    і зварочваў з гасьцінца,
хто наперад
    зьбіраў размах:
хто пайшоў.
    хто дранцьве
        прахадзімцам
у палоне
    сьлюнявых разваг.
Хто-ж застаўся
    надалей двулікім:
верш грамадзтву
    і
        верш—архіву

Хто-ж халтуру
    пудамі пілікаў
у сваім
    захапленьні хцівым.
Я гляджу...
    не знаходжу спакою...
Мяне цісьне...
    Бязьмерна мучыць..
Ну, няўжо-ж
    не ьга так,
        з пераконам,
На ўсе грудзі
    шырозна,
        гучна
прагрымець
    сваім свежым словам,
як юнацтва
    з сучасьсем сябруе...
Мы-ж расьлі
    пад віхор бураломаў,
мы ўзрасьлі-ж
    на абноўленых рунях.
Мы пакажам
    у працы дзейнай,
што жывем
    і расьцем ня дарма.
Дав дзем,
    што з нас кожны удзельнік.
        на франтох пяцігодкі
            ўдарнік.
Рукі нашыя—
    бронза і моц,
гмах упартасьці
    ўдарна створаць.
Вочы нашыя
    сочаць даўно,
дзе варушыцца
    клясавы вораг.
Вы-ж распальвалі
    ветхасьці прымус,
што й лічылі
    за лепшае вы...
Толькі тога
    эпоха прыме,
хто ў поэзіі—
    як бальшавік!
1931 г.

Будзем ударнікамі літаратуры

—Ды што пісьменьнікі.—махалі некаторыя рукамі,—жывуць нейкім асабістым жыцьцём, адарваны ад мас.

Гэты погляд, бязумоўна, ня верны, але таварышы ўсё-ж мелі рацыю так думаць, бо шмат хто з пісьменьнікаў і поэтаў ня пісалі аб нашым сучасным жыцьці, ня былі ахоплены чарнавой работай хаця-б у газэтах, адставалі і яшчэ па гэты час адстаюць ад агульных тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Пленум БелАПП'у гэта яскрава адзначыў.

„Чырвоная Зьмена", прад'явіўшы рахунак БелАППу ўзялася па-ўдарнаму за справу наладжваньня сувязі і працы з пролетпісьменьнікамі і поэтамі, каб сумесна з імі змагацца за гегемонію пролетарскай літаратуры, за новыя кадры пісьменьнікаў і поэтаў--ударнікаў. У часе работ пленуму БелАПП „ЧЗ" організавана літаратурная брыгада, ў якую ўваходзяць БелАППаўцы: Ліхадзіеўскі, Шушкевіч, Таўбін, Мікуліч, Лявонны, Ушакоў, Ананьеў, Алесін, і інш. і частка членаў рабочай літстудыі. На першым паседжаньні літбрыгада распрацавала плян работы.

„Чырвоназьменаўская" літбрыгада ставіць сваёй задачай жыць жыцьцём сёнешняга дню, гнутка прыстасаваўшы сваю працу да цэнтральнай фігуры літаратуры—ударніка, дапамагаць яму ў рабоце. Брыгада будзе займацца ў пераважнасьці выхаваньнем новых пролетарскіх кадраў, комсамольскай тэматыкай, праводзячы ўсю сваю працу ў цеснай сувязі з БелАППам.

АД ЗЬМЕНЫ ШЫЛЬДЫ ПРАЦА НЕ ПАЛЕПШЫЛАСЯ

Колектывы „ДА“, „Бальшавіка“, Мендзяржбуду толькі формальна перабудаваліся па сэктарскай сыстэме

Пераносім цэнтр цяжару ўсёй работы ў брыгады, цэхі, агрэгаты

Надыходзіць справаздачна-перавыбарчая кампанія нізавых комсамольскіх органаў. Пасьпяховасьць правядзеньня гэтай кампаніі залежыць ад таго, як ячэйка, колектыў здолеюць уцягнуць усю масу комсамольскай і рабочай моладзі, мобілізаваць іх на перамогу адстаючых вучасткаў работ.

Шмат комсамольскіх ячэек не перабудавалі яшчэ як сьлед сваю работу што відаць са зьмешчанага сёньня матар'ялу. Організаваныя сэктары бязьдзейнічаюць, рабочая беспартыйная моладзь да ўдзелу ў рабоце сэкратароў не прыцягнута. Абслугоўваньне вячэрніх і начных зьмен яшчэ пастаўлена дрэнна. Цэнтр цяжару ўсёй работы не перанесен у брыгады, цэхі, агрэгаты.

За справаздачна-перавыбарчую кампанію колектыў ячэйкі павінен зьнішчыць гэтыя недахопы ў сваёй рабоце.

На кожнай пабудове— комсамольская ячэйка

У колектыве Мендзяржбуду ні водзін з сэктараў не працуе як належыць. Раней у колектыве было 5 сэктараў: эконом, АПО, шэфскі, вайсковы і „АК“. Але людзі, якія сталі на чале гэтых сэктараў, а тым больш сэктары ў цэлым, ня ведалі сваіх функцый.

6-га мая на бюро колектыву стаяла пытаньне аб перабудове комсамольскай работы ў зьвязку з рашэньнямі зьездаў. Цяпер організаваны новыя сэктары: організацыйна-інструктарскі (выкананьне плянаў, забясьпечаньне будматар'ялаў); сэктар вучобы (політвучоба, вайсковая, тэхнічная, друк.); вытворчы (выпаходства, рацыяналізацыя); шэфскі (колгаснае будаўніцтва, вёска) і вайсковы (вайсковая падрыхтоўка, фізкультпраца). Цяпер кожнаму сэктару, кожнаму працаўніку даецца конкрэтнае заданьне.

У колектыве было 5 ячэек, а аб'яднаў колектыў 29 пабудоў.

Бюро колектыву вынесла пастанову: „на кожнай пабудове організаваць цэхавую комсамольскую ячэйку“. 13 такіх ячэек ужо організавана.

У працу сэктароў, за выключэньнем цэхавай ячэйкі на пабудове абутковай фабрыкі, ніводная цэхячэйка ня ўцягвала беспартыйную моладзь.

Ячэйкі, акрамя пабудовы абутковай фабрыкі і цэнтральных майстэрняў, не вялі працы па ўцягненьню моладзі ў соцспаборніцтва і ўдарніцтва. У час мітынгаў па пытаньню рашэньня 9-га зьезду ЛКСМБ, 45 чалавек падалі заявы аб уступленьні у ЛКСМБ. З агульнага ліку 252 комсамольцаў колектыву, 212 чалавек навучаюцца ў школах дзе разам праходзяць вайсковую і тэхнічную падрыхтоўку. У політбоі колектыў у першых шэрагах. У час паходу за тэхніку была склікана нарада спэцыялістых, выпрацаваны цэлы шэраг лекцый, якія будуць чытацца на спэцыяльна скліканых сходах рабочых. У зьвязку з організацыяй на кожнай пабудове цэх'ячэйкі, комсамольскія групы зьнішчаюцца. У далейшым, з наступленьнем зьменнай працы, будуць організаваны зьменныя ячэйкі. Рашэньне аб перабудове комсамольскай работы было прынята даўно, а ў жыцьцё толькі што пачынае праводзіцца. Організаваныя сэктары ўсё яшчэ не распачалі працу. Організацыйная перабудова працы ідзе, але ідзе марудна.

Патрэбна болеш жывасьці.

Брыгадзір „ЧЗ“
В. Кавалевіч.

ВЫКЛІКАЕМ!

Выклікаем колектыў заводу імя Варашылава на соцспаборніцтва на лепшае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі нізавых комсамольскіх органаў. Праверым і абмяняемся вопытам выкананьня рашэньняў IX і X зьездаў комсамолу. Для праверкі абмену вопытам высылаем на ваш завод нашу юнкораўскую брыгаду „ЧЗ“.

Вышліце на 27 мая г. г. сваіх прадстаўнікоў для выпрацоўкі дагавору па соцспаборніцтву.

Колектыў заводу „Комунар“.

Організуем праверку работ

У рабоце комсамольскага колектыву заводу „Бальшавік“ наглядаецца зрух. Большая частка комсамольцаў працуюць сапраўды паўдарнаму. Напрыклад, брыгада рамшчыкаў, большая частка—комсамольцы, за ўдарную работу прэміравана ВСНГБ на 1500 рублёў. На асобных комсамольцы як Падліпскі, Дзімештэйн, прэміраваны за ўдарную работу.

Але шмат яшчэ недахопаў у рабоце комсамольскай організацыі заводу. Сэктары пры колектыве амаль што не працуюць. Тэмпы росту колектыву незадавальняючыя, ня гледзячы на тое, што база ёсьць. Цэнтр цяжару ўсёй комсамольскай работы яшчэ поўнасьцю не перанесен у брыгаду, цэх. Слабое наведваньне вучобы, сходаў і г. д. У сувязі з правядзеньнем справаздачна-перавыбарчай кампаніі і па пастанове бюро партколектыву, праводзім агляд работы комсамольскай організацыі. Па ўсіх цэхах організаваны брыгады, якія будуць праверыць работу колектыву і ячэек па ўсіх галінах (становішча росту, удзел комсамольцаў у грамадзкім жыцьці, работа комсамольцаў на вытворчасьці і г. д.).

Брыгады ўжо прыступілі да працы. Заводская газэта выпушчае спэцыяльную старонку, прысьвечаную агляду комсамольскай організацыі. Мы ўпэўнены, што гэты агляд дасьць вялікі штуршок усёй комсамольскай рабоце.

Брыгадзір „Ч. З.“ Мінкін З


Не ўхапіліся за галоўнае

Комсамольскі колектыў на заводзе „Д. А.“ мае чатыры сэктары: эканом-вытворчы, агіт-масавы, вайкова-фізкультурны і піонэр-сэктар. За выключэньнем эканом-сэктару і агіт-масавага, — астатнія сэктары амаль не працуюць. На заводзе значная колькасьць беспартыйнай рабочае моладзі, але да працы сэктароў яна ня прыцягвалася.

Дзякуючы добра наладжанай рабоце эканам-вытворчага сэктару, усе комсамольцы ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Пасьля X-га зьезду ЛКСМБ організаваны 9 вытворчых маладзёжных комун, 3 комсамольскія ўдарныя брыгады, 2 узорныя комсамольскія зьмены, якія перавыканалі паказчыкі прамфінпляну. На бюро цэх'ячэйкі і на нарадзе эконом-вытворчага сэктару часта заслухоўваюцца інформацыі брыгадзіраў ўдарных брыгад. Эконом-вытворчым сэктарам організаваны 2 гурткі па вывучэньню тэхнікі свайго прадпрыемства. У гуртках займаецца значная колькасьць беспартыйнай і рабочае моладзі. Організаваны дзьве плянава-опэрацыйныя групы, якія займаюцца пытаньнямі плянаваньня і рацыяналізацыі вытворчасьці (амаль усе рацыяналізатарскія прапановы паступілі ад комсамольцаў).

Аднак, вытворчы сэктар, як і ўвесь колектыў, ня здолеў ухапіцца за тое, што ў даны момант зьяўляецца галоўным для заводу. Заводу пагражае спыненьне працы з-за недахопу ў сыравіны. Комсамольскі колектыў у цэлым і вытворчы сэктар у прыватнасьці, нічога не зрабілі, каб дапамагчы заводу выйсьці з гэтай небясьпекі.

Работа агітмасавага сэктару зьвязваецца ў асноўным з прапрацоўкай рашэньняў IX-га і X-га зьездаў і ў правядзеньні падпіскі на заём. Аднак, гэты сэктар нічога не зрабіў, каб палепшыць стан палітшколы, організаванай пры за-



водзе і наладзіць акуратнае наведваньне яе комсамольцамі.

Бюро колектыву дрэнна кіруе работай сэктароў ячэек. За ўвесь час работы бюро колектыву, вайскова-фізкультурны сэктар амаль не працуе. Абслугоўваньне комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі якія заняты ў вячэрня-начныя зьмены, пастаўлена дрэнна. Сэкратар колектыву тлумачыць гэта тым, што ня было установлена сталага складу зьмены і толькі зараз думаюць організаваць зьменавыя комсамольскія ячэйкі.

Ударныя брыгады „ЧЗ“
Крывіца і Кавалевіч.

Зьлёт менскіх маладых ударнікаў

31-га мая, роўна а 7-й гадз. увеч., у памяшканьні летняга тэатру „Профінтэрн“ адбудзецца зьлёт маладых ударнікаў прадпрыемстваў г. Менску.

Менгарком ЛКСМБ і Гарпрафсавет.

ДАПАМОЖАМ РАЗЬВІЦЬЦЮ ВОБРАЗНАГА МАСТАЦТВА

Беларускім Дзяржаўным Музэем сумесна з організацыяй мастакоў Беларусі „РОМБ“ організавана мастацкая выстаўка-перасоўка для абслугоўваньня рабочых клюбаў і прадпрыемстваў.

Мэтаю выстаўкі зьяўляецца—азнаёміць шырокія працоўныя масы з сучасным становішчам беларускага мастацтва ў яго сувязі з соцбудаўніцтвам і запатрабаваньнямі сучаснасьці.

Некаторы час гэтая выстаўка была ўжо адчынена пры Доме Комасьветы, пры чым пры зачыненьні адбыўся шырокі дыспут, у якім прымалі ўдзел партактыў і працоўныя гораду Менску.

У сучасны момант папоўненая і пашыраная выстаўка перасунута ў Дом Працасьветы, пасьля чаго перасоўваецца ў іншыя клюбы і прадпрыемствы.

Выстаўка абслугоўваецца консультацыяй. Устанаўліваюцца дзяжурствы мастакоў, якія будуць д[…]ваць адпаведныя тлумачэньні. Пр[…] зачыненьні кожнай перасоўкі буду[…] адбывацца дыспуты, якія павін[…] дапамагчы мастакам сумесна з ш[…]рокай працоўнай грамадзкасьцю […] справе шуканьняў і стварэньня н[…]вых форм пролетарскага мастацтв[…]

Вобразнае мастацтва займае […] малаважнае месца ў культурна[…] рэволюцыі. Яно зьяўляецца адным[…] сродкаў організацыі волі і сьвяд[…]масьці працоўных мас, адным[…] сродкаў эмоцыянальна-ідэолёгічна[…] ўзброеньня пролетарыяту. Комс[…]мольскія організацыі, прымаюч[…] пад увагу тую важную ролю і а[…] казнасьць, якая ляжыць на гэта[…] галіне культурнага жыцьця, павін[…]ны ўважліва аднесьціся да гэтаг[…] пытаньня і дапамагчы ў ажыцьця[…]леньні тых адказных задач, як[…] ляжаць перад вобразным маста[…]твам.

Т. В.

Ліст у рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена“

У № 110 газэты „Ч. З.“ ад 16 мая быў зьмешчаны артыкул т. С. Анісава „Ня заўтра, а сёньня“, адносна зборніку вершаў Юркі Лявоннага і маёй рэцэнзіі на азначаны зборнік, якая была зьмешчана ў № 2—„Маладняка“ за 1931 г.

Аўтар артыкулу зусім правільна зачначае на вялікія памылкі ў маёй рэцэнзіі, якія выразіліся ў тым, што я абышоў пытаньне аб клясавасьці зьместу і клясавай вартасьці зборніку, а імкнуўся даводзіць, што вершы Юркі Лявоннага мала мастацкі і ад гэтага бышцым і залежаць галоўныя недахопы ў яго творчасьці.

Галоўны недахоп маёй рэцэнзіі заключаецца ў тым, што я політычна шкодныя вершы, у якіх наводзіцца паклёп на комсамол (напрыклад верш „У паход“ і інш.)—аднашу да добра напісаных вершаў і, такім чынам, высоўваючы на першы плян пытаньне формальных якасьцяй вершаў, зусім абыходжу іх зьмест, што ідзе ўразрэз з установкай па гэтаму пытаньню якое існуе ў марксыцкай мэтодолёгіі.

—Дарэчы тут прывесьці словы т. Авэрбаха, які ў сваім артыкуле („Правда“ № 128—ад 11-га мая г. г.)—піша, што: „Произведение пролетарского писателя должно быть органически большевистским—там же, где произведение подгоняется под большевизм, там дискредитируется большевизм и там режется искусство“.

Тав. Анісаў сваёй рэцэнзіяй давёў маю памылку ў гэтым пытаньні і даў правільнае тлумачэньне сутнасьці вершаў Юркі Лявоннага, якія былі выданы пад шыльдай камсамольскіх вершаў.

У сваім лісьце я хацеў-бы зрабіць наступную заяву:

Мая рэцэнзія мела назву „Гэта сёньня... а заўтра ў паход... За ўладаньне мастацкай культурай“.

Нявыразны тон загалоўку даў та[…] Анісаву повад пытацца, як гэта я[…] рэдакцыя „Маладняка“ адкладаю[…] паход за ўладаньне мастацкай кул[…]турай на заўтра, у той час, як гэ[…]ёсьць наша сёньнешняя справа—спр[…]ва першачарговай важнасьці.

А паміж тым адбылася некато[…]рая недарэчнасьць.

Словы „Гэта сёньня...“ мною бы[…] выкананы у тым сэнсе, што вось гэ[…] мы маем сёньня у вершах Юркі Л[…]вонага (бо размова ідзе аб ім), а ў[…] далейшая праца пісьменьніка павін[…] йсьці па шляху ўладаньня мастацка[…] культурай. Так пісаў я.

Але тое, што гэтыя словы ня бы[…] рэдакцыяй пастаўлены ў коскі—дал[…] повад некаторым таварышам і та[…] Анісаву—лічыць мяне такім чалавека[…] які барацьбу за стварэньне пролета[…]скай культуры адносіць на заўтра[…] лічыць, што гэта зьяўляецца справа[…] другачарговай.

Такога погляду я ніколі ня прытрым[…]ліваўся і ўсю сваю дзейнасьць падпа[…]радкаваў гэтаму галоўнаму пытаньн[…] нашага жыцьця і дапамогу у ств[…]рэньні пролетарскай культуры—нацы[…]янальнай па форме і соцыялістычна[…] па зьместу—лічыў сваім непасрэдны[…] і штодзённым абавязкам.

Слабое ўладаньне мэтодолёгіяй мар[…]сызму і ленінізму спрыяла таму, шт[…] ў іншых маіх рэцэнзіях заўважаец[…] цэлы шэраг памылак, якім я ў бліжэ[…]шы час дам належную крытыку[…] пры дапамозе грамадзкасьці і газэт[…] „Чырвоная Зьмена“, якая перша[…] паказала на іх—змагу выправіць і[…] яшчэ большай ваяўнічасьцю змагац[…] і прылажыць ўсе свае сілы на справ[…] стварэньня пролетарскай культуры.

Эд. Галубок.

г. Менск, 22-У-31 г,

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Конфэрэнцыя чытачоў „Комсомольской Правды“

30-га мая, а 7-й гадз. увеч., у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых Менгарком і Паўпрэдзтва „Комсомольской Правды“ склікаюць конфэрэнцыю чытачоў, юнкораў-ударнікаў „Комсомольской Правды“,—прысьвечаную 6-ці гадоваму юбілею ЦЭ комсамолу—„Комсомольской Правды“.

Парадак дня:

1. Даклад рэдакцыі „Комсомольской Правды“ (Маркевіч);
2. Выступленьне чытачоў—юнкораў ударнікаў;
3. Рапарты комсамольскіх к-ваў;
4. Вялікі концэрт.

Менгарком ЛКСМБ і паўпрэдзтва „Комсомольской Правды“.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599